## Людміла Ніжэвіч

# ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА: УЧОРА І СЁННЯ

Падчас экскурсіі ў наведвальнікаў Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага з'яўляюцца такія пытанні: "Дзе знаходзілася хата, у якой жыў Мікола Раманоўскі, і вучылішча, дзе ён вучыўся?", "З якімі беларускімі пісьменнікамі Кузьма Чорны падтрымліваў сувязь?", "Адкуль чэрпаў ён матэрыял для сваіх твораў?". Адказы на іх можна атрымаць на музейна-педагагічных занятках "Сцяжынкамі пісьменніка", якія падрыхтаваны для вучняў сярэдніх і старшых класаў.

У музеі шасцікласнікі змогуць атрымаць кароткія біяграфічныя звесткі пра пісьменніка і паглядзець відэазапіс інсцэніраванай аповесці Кузьмы Чорнага "Насцечка" ў выкананні ўдзельнікаў тэатральнай студыі "Іскрынка", што працуе пры музеі.

Для тых, хто вывучае раман Кузьмы Чорнага "Пошукі будучыні", прапануецца экскурсія пра жыццё і літаратурную дзейнасць беларускага празаіка, раманіста.

Гонар за свайго земляка Мікалая Карлавіча Раманоўскага, які жыў, вучыўся і некаторы час працаваў у Цімкавічах, натхніў дырэктара школы, заслужаную настаўніцу БССР Зінаіду Іосіфаўну Раманенку на стварэнне музея Кузьмы Чорнага.

Пад яе кіраўніцтвам настаўнікі і вучні Цімкавіцкай школы паставілі для музея спецыяльны будынак і сабралі матэрыял для экспазіцыі.

24 чэрвеня 1964 г. у Цімкавічах быў адкрыты мемарыяльны музей Кузьмы Чорнага. Капыльская раённая газета "Слава працы" ад 30 чэрвеня 1964 г. змясціла рэпартаж У. Гурыновіча пра гэтую падзею, дзе былі такія радкі: "...На ўрачыстае адкрыццё музея прыехалі народны мастак БССР, вядомы скульптар Заір Азгур, беларускія пісьменнікі Анатоль Астрэйка, Сцяпан Александровіч, Іван Кудраўцаў. Сярод ганаровых гасцей сёстры К. Чорнага Марыя Карлаўна і Ганна Карлаўна Раманоўскія, яго дачка Ірына Мікалаеўна Раманоўская... Першы на Капыльшчыне музей гасцінна расчыніў свае дзверы перад наведвальнікамі. Плённа папрацавалі настаўнікі і вучні, каб пабудаваць і абсталяваць музей..." За апошнімі радкамі гэтай газетнай публікацыі – вялікая шматгадовая праца настаўнікаў і вучняў мясцовай школы, якой у 1950 годзе было прысвоена імя Кузьмы Чорнага. Ідэя збіраць і вывучаць творчую спадчыну свайго земляка ўзнікла яшчэ напрыканцы 1940-х гадоў. Ініцыятарам і стваральнікам музея была дырэктар школы, заслужаная настаўніца БССР З. І. Раманенка. Яе энтузіязм і жаданне, запал і энергія, нібы ланцужковая рэакцыя, перадаліся настаўнікам і вучням, якія актыўна

уключыліся ў працу. Збор экспанатаў, узвядзенне ўласнымі сіламі будынка для музея, выраб у школьнай майстэрні вітрын, афармленне экспазіцыі – усё гэта прыносіла задавальненне і выконвалася з разуменнем і адказнасцю.

Вялікую дапамогу ў зборы матэрыялаў аказалі жонка пісьменніка – Рэвека Ізраілеўна Раманоўская, сёстры – Марыя і Ганна, дачка Адама Бабарэкі Алеся, якая добра ведала Кузьму Чорнага, сябар і паплечнік пісьменніка Уладзімір Дубоўка, а таксама супрацоўнікі Літаратурнага музея Янкі Купалы і Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, Саюз пісьменнікаў БССР.

Сярод экспанатаў, што расказваюць пра жыццё і творчасць Кузьмы Чорнага, – фотаздымкі, прыжыццёвыя выданні кніг пісьменніка, фотакопіі рукапісаў ваенных гадоў, асабістыя рэчы, найбольш каштоўныя з якіх – паліто, самавар, а таксама абрус, вытканы маці Гліцэрай Міхайлаўнай Раманоўскай.

Музей плённа працаваў, папаўняўся экспанатамі. Савет музея, у які ўваходзілі настаўнікі і вучні, вёў актыўную працу па прапагандзе творчай спадчыны свайго знакамітага земляка. Адказнай за збор матэрыялаў і правядзенне экскурсій была заслужаная настаўніца БССР Вольга Ільінічна Марціновіч. У сценах музея праходзілі сустрэчы і вечарыны, традыцыйнымі былі святкаванні дня нараджэння пісьменніка.

У розныя гады прыязджалі аддаць даніну памяці выдатнаму майстру слова, яго зямлі і цімкаўцам Я. Скрыган, В. Вітка, С. Грахоўскі, І. Грамовіч, А. Асіпенка, І. Чыгрынаў, М Лобан, М. Хведаровіч, А. Вярцінскі, М. Аўрамчык, В. Адамчык, У. Юрэвіч, П. Кавалёў, Я. Брыль, А. Васілевіч, А. Адамовіч, М. Гамолка, А. Русак, М. Тычына, Я. Янішчыц, А. Рагуля, В. Супрунчук, А. Жук. Сузор'е такіх людзей на цімкавіцкай зямлі – гэта бясспрэчная пашана і высокае прызнанне як самога пісьменніка, так і яго ўдзячных землякоў.

Заўсёды на юбілейных мерапрыемствах былі і родныя Кузьмы Чорнага – сёстры Марыя і Ганна, дачка Рагнеда, унук Мікола, пляменніцы Святлана і Галіна. З гонарам і хваляваннем згадвалі яны свайго брата і бацьку, роднага чалавека, словы іх вялікай удзячнасці гучалі на адрас землякоў, сяброў пісьменніка і прыхільнікаў яго таленту.

Сёння немагчыма пералічыць усіх гасцей, што пабывалі ў музеі, і назваць мясціны, адкуль яны прыехалі, але асобныя пункты на карце свету абазначыць проста неабходна. Студэнты з краін афрыканскага кантынента, госці з Кубы, дэлегацыі з Расійскай Федэрацыі, Украіны, Літвы, Канады, Узбекістана, Латвіі, Германіі, Іспаніі, Францыі...

Прыведзеныя звесткі – гэта сціплае падсумаванне і ўдзячнасць за творчую дзейнасць усім тым людзям, хто меў непасрэднае дачыненне як да арганізацыі музея, так і да яго шматгадовай штодзённай працы.

Канец 1980-х і пачатак 1990-х гг. у жыцці музея, на жаль, не быў плённым. На заслужаным адпачынку ўжо пэўны час знаходзілася З. І. Раманенка, патрабаваў рамонту будынак, ды і сітуацыя ў грамадстве давала новыя магчымасці для асвятлення жыццёвага і творчага шляху Кузьмы Чорнага.

Новы этап у гісторыі музея пачаўся 15 студзеня 1993 г., калі яму быў нададзены статус дзяржаўнага і ён стаў філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. 24 кастрычніка 1994 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё новай экспазіцыі музея.

Для аўтара навуковай канцэпцыі Л. Макарэвіч і мастака Г. Чыстага было важным паказаць Кузьму Чорнага не толькі як творцу, але і як чалавека з чулай і адкрытай душой, чалавека складанага і драматычнага лёсу. Невыпадкова выкарыстаны цытаты з аўтабіяграфіі і з дзённіка пісьменніка. Тактоўна ўведзеныя мастаком у кантэкст кожнай тэмы, яны арганічна спалучаюцца з тымі або іншымі экспанатамі і з'яўляюцца неабходным дадаткам да пэўнага экспазіцыйнага комплексу. Уведзена ў экспазіцыю і шмат іншых сімвалаў і знакаў, якія дазваляюць глыбей зразумець унутраны свет пісьменніка. Наведвальнікі павінны думаць, адчуваць, суперажываць.

Асновай мастацкага рашэння сталі малюнкі Кузьмы Чорнага. Увасобленыя ў павялічаныя аплікацыі, яны выступаюць неад'емнай часткай экспазіцыі, эмацыянальна дапаўняюць яе і робяць цэласным успрыманне асобы пісьменніка.

Сёння Літаратурны музей Кузьмы Чорнага – гэта своеасаблівы культурны і асветніцкі цэнтр. Дарослыя і дзеці, вучні мясцовай школы, наведвальнікі з розных куткоў Беларусі і госці з краін блізкага і далёкага замежжа знаходзяць тут для сябе штосьці важнае і неабходнае.

Літаратурны музей Кузьмы Чорнага найперш зберагае і даносіць да насельніцтва звесткі пра жыццё і творчасць беларускага класіка Кузьмы Чорнага. Вядзецца актыўная праца па прапагандзе творчасці вядомага земляка. Шмат складзена музейна-педагагічных заняткаў у рамках праграмы "Ганарыся сваім земляком і ведай пра яго".

Асаблівае месца займае праца са школьнікамі. Згодна з патрабаваннямі часу ў практыку музея шырока ўведзены музейна-педагагічныя заняткі, якія даюць выдатны плён. Распрацаваны праграмы "Музей і дзеці", "Наша спадчына". Яны прадугледжваюць самыя розныя мерапрыемствы – віктарыны, конкурсы, ранішнікі, святы, чытанні апавяданняў Кузьмы Чорнага.

Паколькі ў Цімкавічах з 1917 г. ужо існаваў драматычны гурток і Кузьма Чорны ўдзельнічаў у пастаноўках, музей працягвае тэатральныя традыцыі. А яшчэ, каб папулярызаваць творы Кузьмы Чорнага і знаёміць насельніцтва і вучняў школ з імі, пры музеі з 1997 г. створана студыя аматараў тэатра "Іскрынка". Удзельнікамі студыі былі пастаўлены апавяданні Кузьмы Чорнага "Маё дзела цялячае", "Родныя мясціны", аповесць "Насцечка", артыкул "У роднай глушы", п'еса "Базылевіча сям'я".

Для выхаванцаў дзіцячага садка і малодшых школьнікаў з 2003 г. працуе тэатр фланелеграфіі "Скарбонка прыгажосці", удзельнікамі якога ставяцца казкі.

З мэтай выхавання моладзі і школьнікаў на аснове беларускага фальклору, далучэння дзяцей да багатай гісторыі, культуры, традыцый роднага краю распрацаваны музейна-педагагічныя заняткі ў рамках праграмы "Наша спадчына". Міністэрства культуры ўхваліла і выдала музейны сшытак "Наша спадчына" ў 2003 г.

Вядзецца праца са старажыламі Цімкавіч. Запісваюцца іх аповеды і ўспаміны. З кожным годам старых людзей становіцца менш і менш. Мы, нашчадкі, павінны хваляваціца і клапаціцца, каб захаваць цікавыя звесткі пра цімкавіцкае мінулае.

*2011, 2014 гг.*